Росстa opTacona Vycгапem.

АДЗІН № КАШТУЕ 35 ГР.

№ 2. (3) СЕРАДА 4-га ЛЮТАГА 1925 г. Год II.

АВАДЗЕНЬ

ДВАТЫДНЕВЫК САТЫРЫ, — ЖАРТАЎ І СЬМЕХУ.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Wilno Завальная 7, пры кнігар.

ПАДПІСКА: |з дастаўкай да хаты|—на 3 мес.=1зл.80гр., на паўгода=3 зл. 50 гр., на год=7 зл.00гр., за граніцу—на год=ТРЫ даляры...

ПАМІЖ БЕЛАРУСАЎ.



—Мірон! Ці думаў ты калі, што гэдак, вось, нашы „пада-бізны" па ўсім сьвеце „А В А Д З Е Н Ь" разнясе?

—Гм...Гэдак я ня думаў. Я толькі заўсёгды спадзеваўся, што прыйдзе час, калі і ў наша ваконца засьвеціць сонца...



ДА ЎСІХ ЧЫТАЧОЎ.

Выпушчаючы гэты нумар, | агулам трэцьці | нашае часапісі АФАРБАВАНЫМ, на спробу, перапрашаем паважаных чытачоў за неяснасьць нікаторых літэраў. Мы жадаем даць ВАМ ня толькі цікавага, а і прыгожага „АВАДНЯ". Гуртуйцеся, браты, каля нашай бязпартыйнай, АГУЛЬНАЙ ды сьмяхотлівай газэткі. Падтрымлівайце матэрьяламі і акуратнай прысылкай грошы. ПАШЫРАЙЦЕ „АВАДНЯ" паміж сваіх знаемых, заахвочайце да падпіскі. Маючы падтрыманьне ад ВАС моральнае ды матэрыяльнае, спадзяемся неўзабаве наставіць „АВАДНЯ" на належную вышыню.

Рэдакцыя.

ПРЫДАЛОСЯ...

Куцьківаючы нагамі
Шоў да хаты дзед-жабрак
І спаткнуўшыся на камень
Наракаць пачаў ён так:
-Вось нашто, сярод дарогі,
Гэты камень тут ляжыць
Ажно глядзь-пад самыногі
Прэць сабака ды вурчыць.
Тут, ня думаючы многа,
Наш жабрак за камень хваць.
Дык сабака, з страху тога-
Толькі яго і відаць.

Алена.

ГАВОРКІЯ.

Мокраю, дажджлівою парой ехалі два паны. Коні памаленьку шлёпалі па гразі. Гутарка ня клеілася. Ехалі і маўчалі... Раптам адзін вываліўся ды, лежучы у гразі, звяртаецца да другога і кажа:

-Ну й пагодка. Каб яна прапала! Як мысьліш, суседзе?

Той маўчыць. На другі дзень толькі, як сам зваліўся, адказаў:

-Так, суседзе, дрэнная...

Ш..а.

ДОБРЫ ПРАМОЎЦА.

Поп надта добра гаварыў казаньне ды так сам сваей гаворкай заахвоцаўся, што у той момант нічога ня чуў і ня бачыў.

На адным казаньні так доўга так цікава казаў, што ўсе людзі павыхадзілі з царквы, а ён усе гаворыць...

Нарэшце, жадыходзе да яго царкоўны стараста ды кажа:

-Бацюшка! Ці доўга будзеце гаварыць?

-А што?

-КАЛІ ЯШЧэ доўга, дык на-це ключы...

-Як скончыце, замкніце царкву, Я пайду ужо дамоў-захацеў есьці.

С---к.

ФАТОГРАФ.

Фатаграф здымае патрэт з нябошчыка. Наладзіўшы свой апарат як трэба, звярачаецца да трупа:

-Ну, цяпер прашу не варушыцца!

С...к.

Баязлівы.

Была-б праўда, аб чым баюць,
Што верх нашы атрымаюць,
Дык пайшоў-ба разам з імі.
Аднак носу лепш ня сунуць,
На ўсіх разам зверху плюнуць,
Тых і гэтых зваць чужымі.
Ой, лепш быці на старожэ,
Нехай бьюцца, а хто зможэ
О, дык я за тых і з тымі.

Алёна.

НЯЎДАЛЫЯ СХОВЫ...

Ксёндз ехаў па-калядзе. Заежджае да вёскі.
У першай хаце жылі бедныя. Матка схавалася у скрыню, а бацька на гару. Ксёндз увайшоў да хаты, зняў брыль ды паклаў на скрыні, сам пачаў сьпяньціць...

Дзяўчынка, якая адна толькі была застаўшыся у хаці, пачала голасна плакаць... Ксёндз пытае:-

-Чаго ты?

Тая, праз сьлёзы адказуе:-Ксёндз маму націснуў брылём...

Ксёндз дагадаўся, адчыніў скрыню... Кабета стыдліва кінулася вітацца... Тым часам дзяўчынка рада, выбегла ў сені ды ляскаючы далонямі крычэла:

-Татка, татка! Лезь з гары: Ксёндз ужо мамку знайшоў у скрыні!

....

А. Васілеўскі.

ююююююююююююююююююююююююююююю
+++++++++++++++++++++++++++++
ююююююююююююююююююююююююююююю

НЯВІННА ПАСУДЖАНЫ.

Злавілі злодзея, які, праходзячы вуліцай украў з вакна гадзіннік.
СУДЗЬДЗЯ:-чаму ты украў гэта?
Злодзей:

-Я ня ўкраў, пане судзьдзя! Было дзела так: я ішоў вуліцай,- а гадзіннік ішоў на вакне, дык мы і пашлі сумесна...

"Восіак"

Жабракі не спакойны.

Ці то праўда ёсьць, ці не,
Ня буду я спорыць
Аднак, чуць прыйшлося мне
Што людзі гаворыць,
Што пан Г. усёж-такі
Завядзэ парадкі
Каб, нарэшце, жабракі
Плацілі падаткі.
Дык, пачуўшы жабракі
Сталі „валнавацца"
І ўрадзілі, бядакі,
Ўсім на сход сабрацца.
Вось пачалі прыхадзіць
І казаць прамовы,
І згадзіліся зрабіць
Гэты пастановы:
„Ня прызнаці ні зашто
„Гэтыя парадкі
„Ды ня будзе з нас ніхто
„Плаціці падаткі.
„Лепш ня станем жабраваць
„У астатку сказалі
„І спакойна будзем спаць
„Каб нас не чапалі."

С.К.

Адказаў...

ПАН. -Я прасіў вас прынясьці віна бутэльку і кубак вады...

Служака. --Вада, паночку, ужо ў віно наліта...

"Восіак".

ВЫТЛУМАЧЫЎ...

-Вы быццам-бы казалі аба мне, што я асёл. Ці гэта праўда?

-Гэта праўда, але я, асабіста ні казаў гэтага...

НАСТАЎНІК ДА ВУЧНЯ:- Чаму салавей, як пяе (песьні), закрывае свае вочы?

ВУЧАНЬ:-Каб ведалі вы, што ён іх умее на памяць.

С----к.

У МЕШЧАНСКАЙ СЯМЬЕ.



Бацька пытаецца у сына:
-З кім ты забаўляўся,як мяне дома ні было?
МАТКА да сына:-Кажы-з мамаю!
СЫН:-З мамаю.
БАЦЬКА:-А мама з кім?
МАТКА ізноў:-Кажы, сынок,з Бозяй!
Сын паставіў вочы на матку ды кажа:
-Цік Бозя ходзіць у форме ды чорных ботах?..

С----к.

: : : : : : : : : :

СЬВЕЧКА...

Купіў сьвечку раз купец,
Падае другому
Дый гаворыць зза плячэй:
„Сяргею сьвятому!"
А той сабе ні дачуў,-
Падае другому
Дый гаворыць зза плячэй:
„Андрэю сьвятому!"
Пашла сьвечка па руках,
А той паглядае,
Вось-жа стараста наперад
З ею выступае,
Да Андрэя проста йдзе...
Купец як папрэцца
Між людзей,наўпярод,
Гвалтам ён ірвецца.
- Да какому,-закрычэў,
„Лепш,дуралею!
Ня энтому,говорят!
Говорят,Сяргею!"

С украінскага Ш---а.

ЧЫТАЙ САМ „АВАДНЯ"
ДАВАЙ ІНШАМУ.

КАРОТКАЯ ПАМЯЦЬ.

Помню ноч і помню лета...
Добра помню той барок,
Помню добра было гэта
Так:прыйшла ка мне Анэта
Ды сьмяецца: ты-Пятрок!
Помню добра,што на гэта
(Сьведкай гэтаму барок)
Адказаў я:-Я,Анэта!
Далі-Бог,я твой Пятрок!
Помню добра,цераз лета
Помню добра ў шэры змрок,
Помню так былося гэта:
Прынясла дзяцё Анэта
Ды і плача:-Ты,Пятрок?
І здаецца,што на гэта
(Надта цёмны быў ужо змрок)
Адказаў я :-Не,Анэта,
Далі-Бог,я не Пятрок!

П---а.

НЯ ЎСЁ РОЎНА.

Ехаў пан з мужыком ля крыжа,Мужык скінуў шапку ды пабожна перажагнаўся,а пан толькі усьміхнуўся.
Хутка па дарозе ім папаўся вярстовы слуп;пан гаворыць да мужыка:-Жагнайся,-усё-ж роўна дрэва,ці крыж ці слуп!
-А чаму пан,вітаючыся з паняй цалуе рукі,а ня..ногі.Усё роўна цела.



-Пятрок!З чаго гэта ты стаў раптам баяцца нашае наймічкі Зосі?
-Але,мамка,..Учора татка хацеў яе пацалаваць,а яна ляснула яму па мордзе! С---к.

СУЧАСНЫЯ ПАЖАДАНЬНІ : ПАД злую мінуту...



-Каб на цябе ізноў падаткі...



КАБ на вас...



Барбос-Жучцы,якая яго укусіла:
-Каб ты спаткалася з ваўком.



...Каб ты аханіўся...

Каб мода ня зьмянілася...

-Куды ты ляціш,сябра?
-Ды,вось,бацыш,-кажа той,паказуючы папяровае пудэлка,-купіў жонцы дарагі капялюх ды бягу,каб хаця данесьці,ато мода можа зьмяніцца.

С----к.

З ХАЎТУРАЎ.

...А мая ты сястрычка!Каб я ведала,што ты памрэш,як-бы табе цукру КУПІЛА...

::::::::

-Янук,а Янук!
-Чаго?
-Чорт бяду ў хату прынёс: бацька памёр...

І.К.

ВОСЬ ЧАМУ...

-Чаму людзі баяцца пекла?
-Бо яно страшна называецца.

БЕЛАРУСКАЯ МУДРАСЬЦЬ.

Загадкі.

1. Чым падпалілі Каін і Абаль свае кастры?
2. Чым ангельцы голюць свае бараду і вусы?
3. Што стаіць на канцы кожнага мястэчка?
4. Куды лятуць птушкі захацеўшы есьці?
5. Чаго хоча бацян|бусял| клякочучы?

Разгадкі.

5. Адазвацца.
4. На жыр.
3. Літэра А.
2. Лязом.
1. Агнем.

о--о.

НЕАПЛАТНАЯ ЛАСКА.

Пісар важна сядзіць
За пісьменным сталом
Ён сягоньня прыймае падаткі
Ды на зло людзі йдуць
Неяк вось па адном,
Аж у пісара робяцца складкі.
Што за ліха,Янук!
Падыходзь да стала
Цяпер будзем мы браць ад скаціны.
Рэгістрацыя ў нас
Ужо даўно прайшла
А ніхто не плаціў з нашай гміны.
Янук.Скольկі табе
За худобу плаціць?
Але...Ў кнізе зьвядзём твае шчоты...
Процэнт твой можам тут
Да граша палічыць,
Хоць ня многа,а будзе работы.
Я не знаю,панок,колькі вам з мяне ўзяць
Бо кабыла нядаўна прапала
Не пакінуў ящчэ
Я па ей бядаваць:
Яна рукі ў мяне адабрала...
-Дык мо скуру садраў
І ўжо жыду прадаў?
Гміна грошы табе не прашчае!
-Дамагаешся пан каб астаткі прадаў?
Нехай пан гэта мне выбачае!
-Як ня будзеш плаціць
Мусіш во напісаць
Да старосты аб гэтым падане...
-Колькі-ж,пане,яно будзе мне каштаваць?
-Адной скуры на гэта но стане...

Ж.Жальба.

АСТРАНОМ І ГАСПАДАР.

-А.чаму сёньня ішоў дождж?
-Г. Бо учора мая карова была задраўшы хвост на хрыбет.
-А чаму на хрыбет?
--БО ведала што сёньня дождж будзе...

б...а.

::::::::::

ПРАКТЫЧНЫ ЖЫД.

Жыд-крамнік сьпяшыўся на кірмаш. Дзеля таго, што воз у яго быў сапсаваны ,ён пазычыў сядло, каб ехаць вярхом. Узьдзеў сядло але ня так,як трэба. Прахадзіўшы сялянін заўважыў гэта і каха да яго:
-Гірша,Ты не так узьдзеў сядло!
-Хэ,а чаму не так?
-Ты узьдзеў задам на перад.
--Гэ,гэ,гэ.Які ты дурню,Янка!адкуль ты ведаеш ,што я паеду наперад,-можа якраз мне трэба - ўзад...

Ш.

ЧАЛАВЕК АД НАЛПЫ.

СЫН ДА БАЦЬКІ:--Тата,кажуць, што чалавек некалі радзіўся ад „налпы",ці гэта праўда?
-НУ,хіба ты ўрадзіўся ад - „налпы",а я то не,-адказаў бацька.

С----к.

УСЕ РОЎНА.

Да войта прынясла баба ігрушаў, за інтэрэсам прыйшоўшы. Той і кажа:

-На што было мясьці: твае - дзеткі зласавалі-б.

-Ды яшчэ што, панок-начальнік, А я дзеткам скажу, што сьвіньня - зьела.

::::
::::

ЦЕСНАЯ ГАЛАВА.

-Скажы сусед, чаму гэта Тодарчык, як пабываў у горадзі дык і мовы роднае забыўся?

-А я яму і казаў: -куды табе брацца у навукі, калі твая галава цесная; бо ня ўсьпеіш аднаго навучыцца, а тоя, што умеў забудзішся, -якно так і выйшла.

::::
::::

ПАНАМ СТАЎ.

АНТОСЬ: -Што ты цяпер, Міхась, парабляіш? Даўно бачыў цябе...

Міхась: -Ня тыкайся са мной, бо я цяпер ня мужык, -сам не раўню сабе спаткаў: мяне усе паліцэйскія у Вільні знаюць, з камісарамі ды судзебнікамі часта гавару, сам прэзэс суда і той да мяне „ПАН" кажа. А ён да мяне сунуўся „Ты" называць!

::::

...Прыехаў беларус з вескі у Вільню ды захацеў праехацца на мягкай каламажцы; падходзіць да вазака, пытаецца:

-Колькі возьмеш, каб завязьці мяне на Зарэчча?

-Тры злотых...

-Ці ты ашалеў! Пусьці мяне на сваё мейсца, дык я цябе за злотага завязу.

Падаў Б-------а.



ЗРАБІЎ ШТУКУ.

У пана быў аляпаваты хурман. Дзе і куды ён ні паедзе, усюдах яго ашальмуюць: то лейцы украдуць то пастронкі, ці вузьдзечку зьнімуць... Карае пан хурмана ды адзін раз і кажа:

-Чаму ты ніколі нічога ня ўкрадзеш, а толькі у цябе ўсе крадуць!

Аднаго разу, выехаўшы з места, хурман быў надта вясёлы і ўсё азіраўся на панскую валізку. Пан зацікавіўся дый пытае:

-Чаго ты, Мікіта, такі вясёлы?

-Эгэ, панок, і я сёньня зрабіў штуку!

-Што? -пытае пан.

-І я сёньня украў...

-Кажы што?

-Мазьніцу з дзёгцем.

-Каб ты-ж прапаў! Вось будзе брыдка, як знойдуць!

-Ну не ў такім мейсцы схавана, каб знайшлі.

-Ну дзе-ж ты яе захаваў?

-Да панскай валізкі...

С---к.

ВЕДАЎ ШТО НЯ ЛЮБІЦЬ...

Жыд, едучы у дарогу з сялянінам, захаваў сабе пад сядзеньням перакуску. Вазьніца абмацаваў яе ды зьеў.

Сваей парой жыд стаў шукаць захаванае і, ня знайшоўшы, кажа да вазьніцы са злосьцьцю:

-Уй, Цімоха, Цімоха! Я тога-то не люблю.

-Я ж вось, і ведаў, што ты яго |сьмеданьня,| ня любіш, ну дык узяў ды зьеў.

С---к.

СОН - НААДВАРОТ.

Лёкай, з вясёлым тварам, падае свайму пану боты раніцай. Пан пытае:

-Чаго, Камрат, ты такі вясёлы?

-Я сёньня сьніў добры сон, быдта паня мне дала два злотых на водку, а пан -паўзлотага ца табаку.

-Дурны-ж ты: сны трэба разумець наадварот.

-Я так і разумею, што ад пана дастану 2 зл., а ад пані-паўзлот.

С---к.

НЕ ЗРАЗУМЕЛІСЯ.



-Замыкай дзві.
-Што,паночку.
-Дзві замыкай.
-Дзеля чаго гэта пану.
-Замыкай-жа.
-А як замыкаць пану,на ка-
роуяму,ці....
-Ах,замыкай,жабы цебе..
-Ну,дык...Мы.. Му..му...
-О,згрозо!.

ПАН І ЖЫД.

Пан заняў у хлеў са шкоды жыдоўскую карову і аддаў яе пад варункам,што жыд перад ім скажэць ненавісное слова „халера". Жыд таргаваўся,але згадзіўся. Прыйшоўшы да пана кажа ён:-Ну,халера.ты!" Пан загневаўся і"крыкнуў:-Йашто кажэш:ну-і ты!Скажы яшчэ раз!Тады жыд і кажа:-Не!-тое слова я раз сказаў„за карову",а ад сябе гэдак ні скажу ніколі...

Акыш.

СВАЯ ПОЧТАА

Нашы грамадзяне ня так ужо санлівы,як усе аб іх думаюць ды пішуць у газэтах і кніжках...

Съведчыць аб гэтым жывая прысылка падпісных грошы і матэрыялаў,чаму радакцыя дужа рада.

Падпіску атрымалі:ад кс.Гадлеўскага,Карпенюка,Сініцкага Яна,Капуцкага,Урбановіча,Латышонка,Міхноўскага,Потаповіча,Паўла Барыса,Самсыта,Біндзюка,Захаронка,Шышкова,Вільчыцкага,В.Кузьміча,Протаса,Ігнацага Мятлы,Хоняўка,Туронка,Караля,М.Сарокі,В.Жэймо,Копко,Петкевіча А.,Пазнаньскай,Козака,Каткоўскай,Талыша,Калядзянікі,С.Строк,ад Ворыка А.-па I зл.80 гр.: ад гр.Шыка,Яміны Ромэйко,і Шышко па 2 зл.: ад гр. Бусько-3 зл.:ад Яцыны з Вільні--4 зл.:ад сем.Уласава-5 зл.----

Журнал прышлём акуратна.

Шчырая падзяка гэтым перасылаецца за прысланые рукапісы грам. К.Сваяку,Алёне,Адвардаму Б.,Ш.і др.супрацоўнікам,

Маладэчанскіх мастакоў просім яшчэ аб рысункі,-з прысланых карыстаем.

Рэдакцыя.

КОЖНЫ НОВЫ ПАДПІШЧЫК-ГЭТА УЖО ПРЫЯЦЕЛЬ„АВАДНЯ"І ШЧЫРЫ ГРАМАДЗЯНІН...

ПАШЫРАЙЦЕ„АВАДНЯ" ПАМІЖ СВАІХ ЗНАЁМЫХ!

Рэдактар-Выдавец А.Васілеўскі.

Rysunki i druk odbito w Lit. Maca Wilno, Dąbrowskiego 3.